Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

28 ЖНІЎНЯ 2007 г. АЎТОРАК
№ 160 (26025)
Кошт 380 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Апошні тыдзень лета будзе халадноватым і амаль без дажджоў

**У аўторак на тэрыторыю краіны з боку краін Заходняй Еўропы зайдзе даволі свежае паветра, — паведаміла карэспандэнту «Звязды» галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.**

Таму сёння ў многіх раёнах, а на працягу тыдня галоўным чынам на поўначы Беларусі, чакаюцца слабыя кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Будзе назірацца даволі моцны парывісты вецер да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы ў апошнія дні лета 5—13, удзень — ад 12—14 градусаў на поўначы да 17—20 на поўдні краіны.

Халаднавата надвор'е і практычна без істотных ападкаў захаваецца ў першыя дні верасня. Так, на выхадных, згодна з папярэднімі прагнозамі, тэмпература паветра ўначы будзе 6—12, удзень — 15—21 градус.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Ліст у нумар

## За маладняк даплачваюць, а за малако — пакуль не

***Хачу атрымаць адказ наконт аплаты з бюджэту за малако, здадзенае насельніцтвам у 2007 годзе. У пачатку года па радыё і ў друку тлумачылі, што за прынятае ад вяскоўцаў малако будуць плаціць 382 рублі за літр. Так яно і было, але вось з красавіка даплату ў памеры 70 рублёў мы не атрымліваем, і ніхто не можа патлумачыць чаму. А статак кароў увесь час змяншаецца: ад 120 галоў некалі да 43 — летась. А на наступны год, напэўна, калі застанецца 15 галоў, будзе добра. Дык ці будзе даплата з бюджэту і калі? Гэта толькі ў нашым раёне так ці паўсюль? З маім меркаваннем згодныя ўсе малаказдатчыкі, таму подпісы кожнага асобна я не збірала.***

**А.К. Федаркевіч,** *в. Палужжа Карэліцкага раёна.*

Па просьбе рэдакцыі адказ на пытанне чытачкі дала выконваючая абавязкі начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Карэліцкага райвыканкама Наталля Чубрык.

— Фінансавыя сродкі на даплату насельніцтву за здадзенае малако выдзяляюцца з Рэспубліканскага фонду падтрымкі сельгасвытворцаў: на ўсе вобласці, затым адтуль — на кожны раён. Выдзеленых сродкаў хапіла, сапраўды, на тры месяцы: студзень, люты, сакавік, — патлумачыла Наталля Пятроўна. — Калі нас выклікалі ў чэрвені ў вобласць, то гаварылася, што будзе хадайніцтва перад міністэрствам аб далейшым выдзяленні фінансавых сродкаў на гэтыя мэты. Аднак, паколькі іх няма, можна меркаваць, што такое рашэнне пакуль не прымалася. Адпаведна, не робіцца з красавіка і даплата малаказдатчыкам за здадзеную прадукцыю. Такая даплата пакуль захоўваецца для насельніцтва толькі за здадзены маладняк буйной рагатай жывёлы — тысяча рублёў за кілаграм жывой вагі. Сродкі на даплату пакуль ёсць.

Энергабяспека

## Спецыялісты для беларускай АЭС змогуць вучыцца ў Расіі і ва Украіне

**Расія і Украіна гатовыя рыхтаваць у сваіх ВНУ грамадзян Беларусі ў якасці спецыялістаў-ядзершчыкаў. Пры гэтым беларусы атрымаюць магчымасць праходзіць практыку на дзеючых АЭС у гэтых краінах. Такую інфармацыю паведаміў журналістам намеснік міністра энергетыкі Рэспублікі Беларусь Міхаіл Міхадзюк, гаворачы пра падрыхтоўку кадраў для АЭС, якую плануецца пабудаваць у рэспубліцы.**

Ён дадаў таксама, што сёння беларускія ўлады атрымліваюць шмат прапаноў «ад беларусаў, якія працуюць на АЭС за мяжой, і ад грамадзян іншых краін прыняць удзел як у будаўніцтве АЭС, так і ў яе далейшай эксплуатацыі».

Намеснік міністра дадаў пры гэтым, што недахоп спецыялістаў-ядзершчыкаў — сённяшняя сусветная праблема. Прычына ў тым, што многія краіны імкнуцца развіваць сваю ядзерную энергетыку, бо «арганічнае паліва мае абмежаваны запас і цана на яго расце».

Міхаіл Міхадзюк паведаміў таксама, што зараз праводзіцца работа па выбару пляцоўкі для магчымага будаўніцтва АЭС. Канчаткова гэта праца будзе завершана ў 2008 годзе. У той жа час папярэднія высновы спецыялісты могуць зрабіць і раней.

Гаворачы пра падрыхтоўку да правядзення тэндэра на будаўніцтва АЭС у Беларусі і пастаўку абсталявання для яе, намеснік міністра адзначыў, што зараз спецыялісты ўважліва вывучаюць «усё, што можа быць прапанавана ў свеце па тых тыпах рэактараў, якія прымальныя для нашай краіны». Спецыялісты мяркуюць, што найбольш аптымальнымі з'яўляюцца рэактары вадавадзянога тыпу. «Такія рэактары сёння працуюць амаль ва ўсіх краінах, якія маюць ядзерную энергетыку... Тэхналогія гэтых рэактараў з'яўляецца найбольш дасканалай».

Міхаіл Міхадзюк паведаміў таксама, што Міністэрства энергетыкі і Нацыянальная акадэмія навук завяршылі працу над праектам Закона «Аб выкарыстанні атамнай энергіі». Зараз дакумент праходзіць неабходныя «ўнутрыдзяржаўныя працэдуры», пасля якіх павінен паступіць у парламент. Паводле слоў намесніка міністра, плануецца, што законапраект будзе накіраваны ў Палату прадстаўнікоў сёлета восенню.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

## УЗДЗЕНСКІЯ ПАЯСЫ

**«Найлепш яны ткуцца нагамі», — упэўнена Кацярына ПАКЛОНСКАЯ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Яна — кіраўнік гуртка «Умелыя рукі» СДК вёскі Зубкі Клецкага раёна, удзельніца рэгіянальнага свята вышыўкі і ткацтва «Умельцы». Яна атрымала званне лаўрэата за арганізацыю пераемнасці традыцыйнай культуры.**

***(Заканчэнне фотарэпартажа на 3-й стар.)***

| Месца | Краіна | З | С | Б | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ЗША | 2 | 2 | 3 | 7 |
| 2 | Эфіопія | 2 | 1 | 0 | 3 |
| 3 | БЕЛАРУСЬ | 1 | 1 | 1 | 3 |
| 4 | Расія | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 5 | Кенія | 1 | 0 | 2 | 3 |
| 6 | Ямайка | 1 | 0 | 1 | 2 |
| 7 | Эквадор | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 7 | Новая Зеландыя | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 7 | Швецыя | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 11 | Багамы | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 11 | Бразілія | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 11 | Славенія | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 11 | Катар | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 11 | Іспанія | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 11 | Турцыя | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 11 | Украіна | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 18 | Германія | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 18 | Вялікабрытанія | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 18 | Славакія | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 18 | Швейцарыя | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 18 | Туніс | 0 | 0 | 1 | 1 |

У японскай Осацы ў суботу стартаваў 11 чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы. Першую ўзнагароду — бронзавую — беларускай камандзе прынёс штурхальнік ядра Андрэй Міхневіч. Спартсмен паказаў вынік 21 метр 27 сантыметраў. Яшчэ адзін наш суайчыннік Юрый Бялоў заняў 8 месца (20 метраў 34 сантыметры), а Павел Лыжын — 20 (19,45). Пераможцам жа і сярэбраным прызёрам адпаведна сталі амерыканцы Рыз Хофа (22 метры 4 сантыметры) і Адам Нельсан (21 метр 61 сантыметр). Дарэчы, «бронзу» Андрэй Міхневіч можа паднесці ў якасці падарунка сваёй жонцы Наталлі, таксама штурхальніцы ядра, якая нядаўна нарадзіла дзіця. Нагадаю, што на мінулым чэмпіянаце свету «золата» ў Міхневіча ў апошняй спробе адабраў немец Ральф Бартэлс. Тыповая сітуацыя зараз адбылася з беларускай штурхальніцай Надзеяй Астапчук: яна выйшла ў сектар у статусе фаварыткі і лідзіравала да апошняй спробы, але заняла другое месца (снарад штурхнула на 20,48). Алімпійская чэмпіёнка Сіднея Яніна Правалінская-Карольчык вярнулася ў спорт пасля дыскваліфікацыі і нараджэння дачкі і стала 10 — 18,17. Мацнейшай жа штурхальніцай аказалася Валерыя Вілі з Новай Зеландыі — 20,54. Калі лідары-штурхальнікі апраўдалі нашы медальныя надзеі, то, на жаль, чэмпіёнка Еўропы Алеся Турава, якая выступае ў бегу на 3 тыс. метраў з перашкодамі, не змагла нават трапіць у фінал. Дарэчы, яе сястра Рыта, якая выступае ў хадзьбе, наогул не адправілася ў Осаку. Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па лёгкай атлетыцы Анатоль Бадуеў растлумачыў адсутнасць лідара ў Осацы тым, што Рыта за апошнія гады не прайграла ніводнага старту на 20-кіламетровай дыстанцыі спартыўнай хадзьбы і таму ёй дазволілі не ехаць на ЧС-2007, улічваючы праблемы са здароўем.

## Молата БАЕЦ!



***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў беларускага спартсмена Івана Ціхана, які заваяваў залаты медаль у спаборніцтвах па кіданню молата на чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы ў японскай Осацы.***

***«Твае стабільнасць, упэўненасць у сабе, духоўная і фізічная загартоўка — гэта, без сумнення, добры арыенцір для ўсіх беларускіх спартсменаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы ў віншавальнай тэлеграме. Аляксандр Лукашэнка пажадаў усёй нацыянальнай камандзе па лёгкай атлетыцы ўдачы на спартыўных п'едэсталах і новых чэмпіёнскіх дасягненняў.***

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

І ўсё ж галоўную інтрыгу «каралева спорту» прыгатавала ў спаборніцтвах кідальнікаў молату. Нашу краіну ў гэтым відзе праграмы прадстаўлялі чэмпіён свету Іван Ціхан (***на фота ў цэнтры***) і яго вечны сапернік Вадзім Дзевятоўскі. Ваня, нягледзячы на статус фаварыта, выйшаў у фінальную васьмёрку, дзе і разыгрываліся медалі, восьмым і толькі з трэцяга кідка (раней ён адпраўляў молат за сектар). Калі Дзевятоўскі паводзіў сябе вельмі эмацыянальна, як заўжды, нешта нашэптваў молату перад спробай і кідаў яго з крыкам, то Ціхан, бы ў казцы пра Іванушку, прыкідваўся прастачком, быццам і не планаваў змагацца за ўзнагароды, але «на флажку» даказаў усім на што ён варты і хто ў сектары сапраўдны ўладар молату. Спартсмен прымусіў пахваляваца сваіх балельшчыкаў, але яго тактыка падманула канкурэнтаў і дазволіла зэканоміць сілы на галоўны кідок.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

## Віншаванне Прэзідэнта

**Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прэзідэнта Малдовы Уладзіміра Вароніна з нацыянальным святам — Днём незалежнасці.**

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць у тым, што высокія адносіны дружбы, павагі і даверу паміж Беларуссю і Малдовай будуць і ў далейшым садзейнічаць пашырэнню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва на карысць двух народаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### 10 ЧАЛАВЕК ТРАПІЛІ Ў АВАРЫЮ...

**Восем чалавек пацярпелі і двое загінулі ў дарожна-транспартным здарэнні, якое на выхадныя адбылося паблізу вёскі Альгіняны, што ў Астравецкім раёне.**

Паводле інфармацыі ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС, буйное ДТЗ зафіксавана каля двух гадзін дня. 34-гадовы вадзіцель, які знаходзіўся за рулём аўтамабіля «Пежо», ажыццяўляючы паварот налева, не справіўся з кіраваннем і выехаў на паласу сустрэчнага руху. У гэты момант і адбылося сутыкненне: па сустрэчнай рухаліся «Жыгулі», якімі кіравала 22-гадовая дзяўчына. Для 24-гадовага пасажыра «Пежо» і 80-гадовай бабулькі, якая ехала ў «Жыгулях», паездка стала ракавой — яны загінулі. Што датычыцца вадзіцеляў аўтамабіляў, то яны разам з пасажырамі — двое знаходзіліся ў «Пежо» і чацвёра — у «Жыгулях» — былі змешчаны ў бальніцу.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ ПАПЯРЭДЖВАЕ ПАРТЫІ

**Міністэрства юстыцыі Беларусі вынесла пісьмовыя папярэджанні шасці палітычным партыям: Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі, Беларускай партыі «Зялёныя», Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), Партыі БНФ, Сацыял-дэмакратычнай партыі Народнай Згоды і Рэспубліканскай партыі.**

Як паведамілі ў міністэрстве, згодна з часткай трэцяй артыкула 10 Закона «Аб палітычных партыях», які быў прыняты ў новай рэдакцыі 19 ліпеня 2005 года, партыі, зарэгістраваныя ў краіне, павінны мець Мінскую гарадскую і абласныя арганізацыйныя структуры ў большасці абласцей (не менш чым у чатырох абласцях).

«Аднак, нягледзячы на неаднаразовыя патрабаванні і папярэджанні Міністэрства юстыцыі, пазначаныя партыі да гэтага часу не стварылі на тэрыторыі Беларусі неабходнай колькасці сваіх арганізацыйных структур», — патлумачылі ў Мінюсце.

Там таксама дадалі, што «палітычныя партыі папярэджаныя, што ў выпадку далейшага ігнаравання вышэйназванага патрабавання закона можа быць пастаўлена пытанне аб прыпыненні іх дзейнасці альбо ліквідацыі ў судовым парадку».

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

### ЗНОЎ ГАРАЦЬ ТАРФЯНІКІ

**Буйны пажар на плошчы каля гектара быў на тарфяніках каля вёскі Чырвонае Возера Салігорскага раёна ў нядзелю.**

Яго тушылі з 8 гадзін раніцы да самага вечара. 9 адзінак тэхнікі і больш за 20 супрацоўнікаў МНЗ, а таксама 7 адзінак тэхнікі і 12 чалавек з мясцовага СВК «Забfroддзе».

А ўсяго толькі за выхадныя на тэрыторыі Мінскай вобласці адбылося 10 пажараў, а за тыдзень пажарныя-выратавальнікі выязджалі на тушэнне пажараў больш за 50 разоў: 47 — на тарфянікі і 8 — на лясныя пажары.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ПАДПАЛІЛА ДОМ З САСТАРЭЛЫМІ СЁСТРАМІ

**Жудасная гісторыя адбылася ў Лагойскім раёне: тут жанчына 1956 года нараджэння сама прызналася пажарнаму інспектару ў наўмысным падпале, ахвярамі якога сталі два чалавекі.**

Паводле інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, гэта жанчына і раней падпальвала маёмасць і жылы дом, у чым сама ж прызналася пажарнаму інспектару. На гэты раз падзеі развіваліся прыкладна так: яна, нешта не падзяліўшы з дзвюма сёстрамі-пенсіянеркамі 1921 і 1925 гадоў нараджэння, увечары вярнулася да іх дома, запіхнула ў шчыліны зачыненай знутры веранды паперу і падпаліла яе. У жыллі спрацаваў аўтаномны пажарны апавяшчальнік, які разбудзіў жанчын, аднак шлях з дома ўжо быў адрэзаны агнём. Праз вокны састарэлыя жанчыны выбрацца не змаглі, да таго ж, відавочна, крыху затрымаліся, спрабуючы выратаваць дакументы і грошы... Падпальшчыца затрымана.

**Сяргей РАСОЛЬКА, Ігар ГРЫШЫН.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

проводит открытый аукцион по продаже обращенных в доход государства: **Лот № 1:** здание цеха (об. пл. – 1216,4 кв.м), расположенного по адресу: Минский район, д. Дубовляны. Начальная цена – 379 064 400 белорусских рублей; **Лот № 2:** здание магазина «Солнышко» (об. пл. 98 кв.м), Минский район, д. Дубовляны. Начальная цена – 37 097 775 бел. рублей. **Лот № 3:** птичник № 2 (об. пл. 877,9 кв.м), Минский район, д. Тарасово. Начальная цена – 158 843 685 бел. руб. Размер задатка составляет 10 % от начальной цены лота и перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **28 сентября 2007 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **27 сентября 2007 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН (8-017) 224-61-34.**
**НАШ САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT .BY.**

А на мой погляд...

## З КУРЭННЕМ ТРЭБА ЗМАГАЦЦА, але да радыкальных метадаў мы не гатовыя

**Апошнім часам пайшла пагалоска, што людзей, якія кураць, у перспектыве не будуць браць на працу на пэўныя спецыяльнасці, калі яны не пазбавяцца ад гэтай згубнай звычкі (не будзем абмяркоўваць такі крытэрый, проста прымаем сітуацыю як факт). Раней ужо гаварылася, што будзе забаронена курэнне ў грамадскіх месцах (у многіх арганізацыях, на некаторых тэрыторыях кшталту рынкаў абоі месцаў адпачынку такая забарона дзейнічае ўжо даўно). Выпадкова ці не, але днямі ў Расіі абмяркоўвалася магчымасць увядзення забароны на дэманстрацыю працэсу курэння, у прыватнасці, у кінастужках (з ранейшых фільмаў такія эпізоды будуць выразаць? — С.С.).**

**Ніхто не аспрэчвае, што курэнне прыводзіць да захворванняў. Курыць шмат моладзі, а гэта для дзяржавы, грамадства, эканомікі недапушчальна. З навалай трэба змагацца.**

**Вы згодны з такімі кардынальнымі захадамі, найперш адміністрацыйнага плану? Ці барацьбу з курэннем трэба весці пакрысе: ад стварэння курылак (каб курцы іншым не перашкаджалі), магчымай даплаты чалавеку, які добраахвотна кіне курыць, да поўнай забароны?**

***Галіна БУХАВЕЦ, дырэктар Аюцавіцкай базавай школы-сада Карэліцкага раёна:***

— Як настаўнік я прытрымліваюся думкі, што ўсё трэба рабіць паступова, найперш праз метады ўздзеяння, каб чалавек сам пакрысе дайшоў да таго, каб свядома кінуць курыць. Прымусовыя меры наўрад ці дадуць пажаданы вынік. Напрыклад, у нашай навучальнай установе апошнім часам шмат робіцца па прапагандзе здаровага ладу жыцця. Дзякуючы ў тым ліку і гэтаму сярод навучэнцаў няма курцоў, хоць гады два таму такія выпадкі адзначаліся. Што да нашага калектыву, дык амаль усе работнікі — жанчыны, якія, зразумела, не кураць. Не мае такой згубнай звычкі і адзіны мужчына-настаўнік. Кураць толькі рабочыя, прычым на вуліцы ў спецыяльна адведзеным месцы. Думаю, што меры матэрыяльнага заахвочвання (даплата да зарплаты, прэмія) маглі б вельмі пасадзейнічаць таму, каб чалавек сам імкнуўся кінуць курыць. Такое палажэнне можна было б закласці ў калектыўны дагавор.

***Уладзімір Н., супрацоўнік Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя (прозвішча і пасаду папрасіў не ўказваць):***

— Асабіста я за другі, больш мяккі варыянт. Выхаваўчую работу нельга замяняць прымусовымі мерамі. Сам я, дарэчы, не куру, але звычка маіх калег мне не перашкаджае, паколькі кураць яны ў спецыяльна адведзеных месцах. Наконт матэрыяльнага стымулу... Думаю, важнай ролі ён не адыграе, паколькі чалавек, які кіне курыць, усё роўна будзе ў выйгрышы, бо зберажэ ўласнае здароўе. Калі ж такое заахвочванне і ўводзіць, дык вельмі асцярожна і прадумана, з дакладнымі крытэрыямі. Гэта трэба для таго, каб, напрыклад, не справакаваць некага: пачну курыць, каб потым кінуць і атрымаць прэмію.

***Наталля АЛЯШКЕВІЧ, памочнік міністра сувязі і інфарматызацыі:***

— У маёй сям'і ніхто не курыць, і я ніколі не спрабавала. Таму да курцоў у мяне стаўленне вельмі адмоўнае. Асабліва непрыемна, калі нехта курыць побач з табой у грамадскім месцы, напрыклад, пускае дым літаральна табе ў твар на прыпынку грамадскага транспарту. Вельмі дрэнна пераношу нават пах тытуню. З іншага боку, давайце паразважаем: чалавеку — прафесіяналу, выдатнаму работніку — могуць адмовіць у прыёме на працу толькі на той падставе, што ён курыць?! Але адзін курыць, а другі не ўмее вадзіць машыну. Не, з радыкальнымі метадамі трэба быць асцярожнымі. Калі чалавек курыў усё жыццё, як ён можа за адзін дзень пазбавіцца ад гэтай звычкі? У невялікіх прыватных кампаніях, ведаю, сапраўды ёсць эканамічнае стымуляванне тых, хто кінуў курыць. З дзяржструктурамі больш складана. А ўвогуле весці прапаганду здаровага ладу жыцця трэба паступова, прадумана і, галоўнае, з самага маленства.

***Аляксандр ГЕРАШЧАНКА, начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Чачэрскаму раёну:***

— Сам я куру. Так, раней, у маладосці, спрабаваў некалькі разоў пазбавіцца ад гэтай звычкі. Што мне дапамагло б зараз? Нейкі стымул, сапраўды, быў бы да месца. Можа, і праўда, трэба менш паказваць на экранах людзей, якія кураць. Адназначна трэба яшчэ больш зменшыць аб'ём рэкламы тытуню. Я падтрымліваю ўвядзенне забароны на курэнне ў грамадскіх месцах, на тым жа прыпынку грамадскага транспарту, бо гэта і пытанне экалогіі, і культуры, і павагі да бліжняга. Але я супраць нейкіх радыкальных мераў. Лічу, што мы да гэтага яшчэ не гатовы. Калі быць шчырым, курэнне — свайго кшталту бяда для чалавека, яму трэба дапамагчы пераадолець яе, а не караць яшчэ больш (ён і так псуе ўласнае здароўе), адмаўляючы ў месцы працы.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПРЭЗІДЭНТ МАЛДОВЫ ЗАБАРАНІЎ РАССПАЖЫЎНАГЛЯДУ ІНСПЕКТАВАЦЬ ВІНЗАВОДЫ

**«Расспажыўнагляд больш не будзе правяраць нашы вінаробныя прадпрыемствы. Мы іх не будзем пускаць у Малдову. Мы не калонія, і не можа метраполія прыехаць да нас з інспекцыяй», — заявіў прэзідэнт Малдовы Уладзімір Варонін каналу NIT.**

Паводле слоў Вароніна, «калі за гэтым стаяць інтарэсы нейкіх карумпаваных структур, то няхай Расія з імі разбіраецца сама. Яны ж не едуць у Францыю ці Італію кантраляваць там вытворчасць віна». Не выключана, што такая рэзкая крытыка прэзідэнта Малдовы звязана з відавочным выбарчым падыходам, якім кіруецца кіраўнік Расспажыўнагляду Генадзь Анішчанка, — расійскія інспектары спачатку далі зялёнае святло ўсяго пяці малдаўскім вытворцам. Частка гэтых кампаній яшчэ некалькі гадоў таму была набыта расійскімі бізнэсменамі, а астатнія знаходзяцца ў непрызнанай Прыднястроўскай рэспубліцы.

«Больш няма сіл слухаць напады Анішчанкі, якія інакш як лухтой назваць немагчыма. Мы вельмі скрупулёзна выконваем нашы абавязацельствы, а Генадзь Анішчанка, падобна, увайшоў у ролю акцёра і пастаянна выдумляе небыліцы, — заявіў кіраўнік аграпрамысловага агенцтва Moldova-Vin Валерый Міранеску. — У Расіі нехта павінен паставіць Анішчанку на месца і прымусіць яго выконваць свае абавязкі, а не шукаць мух за тры тысячы кіламетраў ад Расіі».

### ГРЭЦЫЯ: ЗА ПАДПАЛЬШЧЫКАЎ — МІЛЬЁН ЕЎРА

**Урад Грэцыі аб'явіў пра ўзнагароду на суму да мільёна еўра за дапамогу ў затрыманні падпальшчыкаў лясоў. Ужо арыштаваны сем чалавек, якіх падазраюць у злачынстве, знойдзены рэшткі некалькіх саматужных механічных падпалаў, зробленых з газавых балонаў, і абгарэлыя анучы з пахам бензіну.**



Улады перакананы, што многія з соцень ачагоў узгарання, якія ўзніклі ў краіне на працягу толькі пятніцы, сталі вынікам спецыяльна спланаваных падпалаў. Тэлеканалы паказалі зроблены на мабільны тэлефон відэазапіс, на якім бачны дзеянні двух падпальшчыкаў у раёне гары Імітас, у прыгарадзе Афінаў.

Маштабныя лясныя пажары, якія ахапілі Грэцыю з пятніцы, у пік 40-градуснай гарачыні і штармавых вятроў, прывялі да гібелі 62 чалавек. Шмат людзей атрымалі моцныя апёкі і іншыя раненні, некаторыя зніклі без вестак. Агнём знішчана 500 дамоў, дзесяткі тысяч гектараў лесу і сельскагаспадарчых угоддзяў. У суботу ўрад увёў надзвычайнае становішча ва ўсіх раёнах краіны. Абвешчана жалоба па загінулых.

### «РАДА, ГУДБАЙ!»

**Выбарчы блок «За сваіх!», які ўзначаліў украінскі выканаўца Андрэй Данілка, больш вядомы пад псеўданімам Верка Сярдзючка, не будзе ўдзельнічаць у датэрміновых парламенцкіх выбарах.**



У апошні момант лідар блока адмовіўся ад прэтэнзій на дэпутацкі мандат. Застаўшыся без Данілкі, гэта палітычнае аб'яднанне нават не стала падаваць дакументы ў ЦВК. Як патлумачыў журналістам кіраўнік украінскіх ліберал-дэмакратаў Ігар Душын, лідар блока «не спалохаўся паразы, а проста ўстрымаўся, палічыўшы гэта несвоечасовым».

### НАВАБРАНЦАЎ У АРМІЮ ЗША ЗАМАНЬВАЮЦЬ ПРЭМІЯЙ

**Навабранцаў у амерыканскую армію заманьваюць прэміяй у 20 тыс. долараў, піша The Washington Post. Гэта сума на 2,5 тыс. долараў перавышае гадавую зарплату радавога ва УС ЗША.**

Армейскія чыноўнікі лічаць, што праграма дапаможа справіцца з недаборам, які, пачынаючы з 2006 года, склаў 80 тыс. чалавек. Як адзначае газета, сёлета на працягу некалькіх месяцаў таксама адчувалася вялікая няхватка навабранцаў. Непапулярнасць армейскай службы тлумачыцца войнамі ў Іраку і Афганістане.

### ТУРЫСТ ПАДПАЛІЎ ЯЛЦІНСКІ ЗАПАВЕДНІК

**У Ялцінскім горна-лясным запаведніку гарыць больш за 50 га лесу.**



Як паведамляе адміністрацыя Крыма, пажар распачаўся пасля таго, як турыст з Харкава распаліў вогнішча, каб прыцягнуць да сябе ўвагу выратавальнікаў: ён узняўся ў гару на небяспечную вышыню і не змог самастойна спусціцца. У выніку пажару загінулі два чалавекі — іх целы знайшлі ў машыне ў палаючым лесе. Падчас тушэння агню таксама пацярпелі двое супрацоўнікаў МНС. Турыст, які стаў прычынай ЧП, знойдзены выратавальнікамі і затрыманы міліцыяй.

У тушэнні пажару задзейнічана больш за 800 чалавек і 40 адзінак тэхнікі.

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.08.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 147,00 |
| 1 еўра | 2 933,77 |
| 1 латвійскі лат | 4 201,98 |
| 1 літоўскі літ | 849,71 |
| 1 чэшская крона | 105,79 |
| 1 польскі злоты | 765,60 |
| 1 расійскі рубель | 83,69 |
| 1 украінская грыўня | 428,14 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 25,6544 |
| 10 UAH | 50,9896 |
| 1000 BYR | 11,9267 |
| EUR | 35,0773 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 27.08.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2140 / 2210 |

**Агенцтва Уладзіміра Граўцова**

*Падпісвайцеся на часопіс «Галоўны Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

ISSN 1990 - 763X
07160>
9 771990 763008

# БУСЛЫ ВІТАЮЦЬ РУДАБЕЛКУ











У райцэнтры Акцябрскі адбылося святкаванне 500-годдзя вёскі Рудабелкі (Рудыя Белкі), якая ў даўніну ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага. З тых часоў да сённяшніх дзён назва Рудабелкі ўзгадваецца ў повязі са шматлікімі гістарычнымі падзеямі як прыклад працоўнай і баявой славы.

Сцэнарый свята, якое адбылося на гарадскім стадыёне, безумоўна, не прадугледжваў гэтую прыемную нечаканасць: калі на зялёным полі самадзейныя артысты натхнёна спявалі, а тысячы гледачоў падтрымлівалі песню, у небе з'явілася чарада буслоў. Белакрылыя птушкі кружылі над стадыёнам, быццам далучаліся да свята гэтага цудоўнага куточка беларускага Палесся.

Відаць, з той вышыні добра быў бачны папрыгажэўшы гарадскі пасёлак — да гэтага дня жыхары рыхтаваліся загадзя: чакалі гасцей з блізкіх вёсак і з далёкіх гарадоў. На цэнтральнай плошчы ўстанавілі памятны знак «500 гадоў Рудабелкі» з тэкстам старажытнай граматы, дзе нашы далёкія продкі ўпершыню ўзгадвалі пра гэтае паселішча. Тэатралізаванае свята, выставы творчасці мясцовых майстроў, частаванне стравамі народнай кухні, спартыўнае шоў і гарадскі баль — усё гэта злілося ў стракаты карагод, які аб'яднаў тутэйшых жыхароў і землякоў, што прыехалі здалёк. Запомніліся словы песні-гімна, якая гучала над горадам:

*Легендамі і казкамі абласканы*
*Наследнік таямніц сівых вякоў,*
*Славутай Рудабелкі сын — Акцябрскі,*
*Ты гордасць, гонар, слава землякоў!*

**Яўген ПЯСЕЦКІ (фота аўтара).**

***НА ЗДЫМКАХ:***
***1. На цэнтральнай плошчы Акцябрскага ганаровую варту неслі мясцовыя школьнікі.***
***2. Максім БАЛЫНСКІ з Акцябрскага таксама прымаў удзел у святочным канцэрце.***
***3. Такі каравай прывезла на свята Любоў ФІЛІПОВІЧ з вёскі Вуглы.***
***4. Сярод ветэранаў працы, запрошаных на святочныя трыбуны, быў трактарыст ПМК-37 Анатоль КАВАЛЕВІЧ.***

Інфарм-укол

## СМЯЯЦЦА І ПАБОЛЕЙ

Даследаванні амерыканскага таварыства неўролагаў даказваюць, што нават успаміны пра тыя моманты, калі вы няспынна рагаталі, здымае стомленасць і папярэджвае дэпрэсію.

## БОЯЗЬ АДПАЧЫНКУ

**Апытанні паказваюць, што каля 5 працэнтаў працаздольнага насельніцтва розных краін пакутуе ад так званага сіндрому менеджара.**

Першая прыкмета расстройства — вы знаходзіце нагоду папрацаваць у выхадныя. Пасля адкладваеце адпачынак, паколькі нічога не паспяваеце. Акрамя таго, вы перакананы, што за два тыдні вашай адсутнасці на рабоце можа здарыцца нешта жудаснае. Перфекцыянізм — адметная рыса ўсіх работнікаў, падвержаных «сіндрому менеджара». Ім чамусьці здаецца, што выканаць работу якасна можна толькі ў тым выпадку, калі праводзіць у офісе суткі напралёт. Працаголікі не ўмеюць адключацца ад думак аб рабоце, у выніку ўвесь адпачынак кату пад хвост — яны толькі даймаюць сябе думкамі: «Як там без мяне мая аптычная мышка?». На жаль без дапамогі псіхолага гэты сіндром не перамагчы.

## ЯКОЕ ЛЕТА БЕЗ МАНГА?

**У многіх краінах свету манга — сімвал лета.**

Манга сярэдніх памераў утрымлівае 40 працэнтаў штодзённай нормы клятчаткі, багаты на антыаксіданты, вітаміны А і С, калій і іншыя жыццёва важныя мікраэлементы.

## РАНІЦАЙ — ЯЙКА І ВАДА З ЛІМОНАМ

Амерыканскі медыцынскі цэнтр Рочэстара правёў даследаванне:



жанчыны з лішняй вагой на працягу некаторага часу пачыналі дзень з яйка на сняданак. У выніку аб'ём калорый, які кожная з іх спажывала за дзень, скараціўся на 400 ккал. Пры гэтым «паддоследныя» не сядзелі на дыеце — ім проста не хацелася есці! Галоўнае — яйка павінна быць вараным, без соусаў і солі. Калі вы не прывыклі да такога смаку, заядайце яйка бутэрбродам з рыбай ці падсоленай салатай.

Кожную раніцу выпівайце дзве—тры шклянкі вады з лімонам. Свежая вада «зарадзіць» кішэчнік, лімон падтрымае печань, а цытрусавы пах абудзіць ад сну. Раз у месяц на працягу тыдня харчуйцеся паводле наступнай праграмы: свежае лепш за варанае, запечанае лепш за смажанае, у рацыёне абавязковыя вада, гародніна і фрукты.

## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.10 | 20.11 | 14.01 |
| Віцебск — | 5.57 | 20.03 | 14.06 |
| Магілёў — | 6.00 | 20.01 | 14.01 |
| Гомель — | 6.00 | 19.54 | 13.54 |
| Гродна — | 6.25 | 20.25 | 14.00 |
| Брэст — | 6.29 | 20.23 | 13.54 |

**Месяц**

*Поўня 13.36.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

**Імяніны**

*Пр. ПАРЦЫСТАЯ (УСПЕННЕ БАГАРОДЗІЦЫ);*
*К. Патрыцы, Аляксея, Аляксандра, Аўгустына.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +17 — +19 °C | Без ападкаў | МАСКВА | +13 — +15 °C | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | +16 — +18 °C | Без ападкаў | РЫГА | +15 — +17 °C | |
| КІЕЎ | +17 — +19 °C | Без ападкаў | С-ПЕЦЯРБУРГ | +12 — +14 °C | |

## 28 жніўня

**Дзве даты**



**1652 год** — горад Слуцк атрымаў герб — на блакітным полі сярэбраны крылаты конь, на ягонай чырвонай папоне пад княжай каронай — манаграма. Упершыню Слуцк упамінаецца ў «Аповесці мінулых часоў» у 1116 годзе, калі належаў Уладзіміру Манамаху.

**1749 год** — нарадзіўся Іаган Гётэ, нямецкі паэт, заснавальнік нямецкай літаратуры Новага часу.

**Цытата дня:**

*«У дзіцей няма ні мінулага, ні будучага. Затое, у адрозненне ад нас, дарослых, яны ўмеюць карыстацца днём сённяшнім».*
*Жан дэ Лабруер (1645—1696), французскі пісьменнік.*

РАДЗІННАЕ

# «Благаславіце, добрыя людзі, нявесту ў дарогу збіраць»

## Беларускае традыцыйнае вяселле

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 25 жніўня.)*

### Выхад маладых з хаты нявесты

Пасля непрацяглага частавання пачыналі рыхтавацца да адпраўлення ў храм. Перад гэтым, звычайна, маладая ішла ў чырвоны кут, станавілася перад абразом, «чытала» падарожную малітву, затым «пускала голас» (г.зн. плакала, галасіла аб сваёй дзявоцкай долі) і развітвалася са сваімі роднымі: падыходзіла спачатку да бацькоў, а затым да блізкіх сваякоў, кланялася ім у пояс і кожнага цалавала. Той, з кім яна развітвалася, жадаў ёй «шчасця-долі».

На Міншчыне і сёння захаваўся цікавы абрад адпраўкі маладых пад вянец. Бацька і маці бралі па бохану непачатага хлеба, загортвалі іх у чырвоныя канцы ручніка (таго самага, якім бацька апаясваў дачку, калі абводзіў вакол стала). Адной рукой яны трымалі хлеб, а другой уздымалі сярэдзіну ручніка, утвараючы тым самым падабенства трыумфальнай аркі (страхі хаты, вясёлкі, сімвала шчасця — падковы) перад самім парогам хаты. Пры гэтым маці павінна была стаяць з левага боку ад увахода, а бацька — з правага. Маладыя праходзілі праз імправізаваную «браму неўміручасці», абавязкова нахіліўшы галовы (так, каб не дакрануцца да ручніка), г.зн. пакланіўшыся парогу — старажытнай зоне пахавання продкаў.

### «Замыканне» ў круг

У двары ўсіх тых, хто паедзе на вянчанне, чакаў вясельны поезд, упрыгожаны адпаведнымі сімвалічнымі знакамі. Жаніх са сваёй дружынай сядалі на першую брычку, нявеста і яе сяброўкі (яна ішла за-муж, услед за-муж-ам) — на наступныя.

Як толькі маладыя рассаджваліся па сваіх месцах, бацька і маці маладой выходзілі з хаты, каб выканаць важныя рытуальныя дзеянні, скіраваныя на захаванне вясельнага картэжа на ўсім шляху — ад хаты да храма і назад. Бацька выносіў з хаты абраз, маці трымала ў руках посуд з зернем жыта. Парай яны тройчы абходзілі вакол вясельнага картэжа, рухаючыся «па сонцы».

Такія рытуальныя дзеянні сімвалізавалі «замыканне» ўсіх удзельнікаў абраду ў сімвалічнае кола, якое на працягу ўсяго далейшага шляху не павінна было разрывацца ні пры якіх абставінах.

У некаторых рэгіёнах вясельны картэж абходзілі з поўным вядром вады, якую потым вылівалі пад колы. Сімволіка гэтага атрыбута і рытуальнага дзеяння стане цалкам зразумелая, калі мы ўзгадаем аб іншых рытуальных кантэкстах, у якіх выкарыстоўвалася вада. Маладыя «паміраюць» у статусе «юнак-дзяўчына» і пераходзяць у іншы сацыяльны стан — мужа і жонкі. Гэты рытуальны пераход павінен быў змыць сляды ранейшага жыцця, а затым нанесці зашыфраваны тэкст новага.

### І зноў пра магічнае кола

Кола — адна з найбольш значных і распаўсюджаных геаметрычных фігур — стала знакам цыклічнасці часу і дзялення прасторы на сваё і чужое. Круг у традыцыях народнай культуры многіх народаў свету быў нададзены статусам дасканаласці, таму што ў яго не існуе ні пачатку, ні канца. Кола (форма круга) стала знакам вечнага руху і абнаўлення.

■ Абход, абворванне, апаясванне — рытуальныя дзеянні нашых продкаў, якія выконваліся па кругу злева направа (г.зн. па сонцы), калі жадалі працягу; накірунак руху справа налева (г.зн. супраць сонца) сведчыў аб жаданні спыніць які-небудзь працэс.

■ У старажытнасці нашы продкі, перш чым пачаць будаўніцтва хаты, абворвалі пэўную тэрыторыю, акрэсліваючы тым самым сакральнае месца будучай вёскі.

■ Абворванне вёскі (рытуальныя дзеянні групы аднавяскоўцаў, скіраваныя на акрэсліванне жыллёвай прасторы) выкарыстоўвалі з той нагоды, каб захаваць людзей і жывёлу ў час эпідэмій, якія ў народзе мелі назву «мор».

■ На працягу года практычна ва ўсе вялікія святы — на Каляды, Вялікдзень, Юр'еў дзень, на пачатку сяўбы, у час засухі або пры працяглых дажджах — выконвалі абход усіх двароў:

■ Абрадавыя танцы нашых продкаў — карагоды — былі нічым іншым, як рытуальным дзеяннем, якое зноў-такі замыкала адпаведную прастору ў магічнае кола.

■ У рытуалах сямейнай накіраванасці: на вяселлі, пры нараджэнні і хрышчэнні дзіцяці абход вакол стала, хаты, вясельнага поезда выконвалі таксама па кругу.

■ Шэраг рытуальных дзеянняў, накіраваных на аб'яднанне (злучэнне), выконвалі пры дапамозе круга, напрыклад, каб куры не разбегліся з двара, на Каляды іх кармілі «у крузе»: на падлогу клалі абруч, у сярэдзіну насыпалі зерне і склікалі курэй.

■ Рух па кругу стаў складовай народнай медыцыны: хворага трэба было тройчы абвесці вакол сакральнага месца, каб пазбавіць ад хваробы.

■ Малюнак круга на зямлі — абвядзенне рытуальным прадметам (нажом, крэйдай, вугалем і г.д.) — нашы продкі выкарыстоўвалі, каб абараніць сябе і сваіх блізкіх ад нячыстай сілы. Пры гэтым чыталіся малітвы і замовы: «Бог у крузе, бес — па-за кругам». Або так: «Вакол мяне круг, малявала яго не я, а Багародзіца мая».

■ Рэчы, якія лічыліся абярэгамі для чалавека: пярсцёнкі, бранзалеты, каралі, скроневыя колцы — таксама былі ў форме круга.

### Захоўваць традыцыі мінулага або крочыць у нагу з часам

Абрад, у час якога бацькі абходзяць вясельны картэж, цалкам захаваўся і ў сучасным вяселлі. Праўда, большасць сучаснікаў трымаюць у памяці ці пераймалі толькі знешні рытуальны і атрыбутыўны бок, але не цалкам разумеюць іх сэнсаўтваральную накіраванасць, тым самым ствараючы сабе і маладым праблемы. Давайце больш падрабязна і канкрэтна спынімся на гэтай сітуацыі.

**Па-першае,** нашы сучаснікі павінны памятаць, што ў першую машыну садзіцца жаніх, у другую — нявеста.

**Па-другое,** перад тым, як вясельны поезд адправіцца ў дарогу, бацькі тройчы абыдуць вакол яго па сонцы і абсыплюць зернем жыта, г.зн. яны «замкнуць» удзельнікаў вянчання ў магічны круг, каб па дарозе туды і назад ніхто не змог нашкодзіць маладым. На сучасных гарадскіх вяселлях часам даводзіцца бачыць, як маці маладой абходзіць і абсыпае толькі тую машыну, у якой сядзіць яе дачка. Усё зразумела: бліжэй да цела свая сарочка, але ж з той хвіліны, як вы блаславілі **ПАРУ** на вянчанне і да самага заканчэння вяселля ўсе абрадавыя дзеянні будуць скіраваны толькі на замацаванне пары.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гэтая пазіцыя патрабуе вельмі абачлівага і ўзважанага працягу, які закранае адзін з найважнейшых аспектаў абрадавай кампазіцыі, што разгортваецца ў ЗАГСе. У савецкія часы стала модным наваўвядзеннем абавязковая прысутнасць бацькоў маладых, якім адразу ж пасля рэгістрацыі шлюбу першым надавалася права павіншаваць маладых. У кантэксце і традыцыйнага абраду, і яго сучаснай мадыфікацыі гэтая навацыя выглядае, мякка кажучы, поўным парадоксам. Давайце яшчэ раз узгадаем сутнасць рытуальнай дзеі, выконваемай бацькамі нявесты. **Яны ўзводзяць вакол вясельнага картэжа непранікальную магічную сцэну.** Але як толькі яны ж сядуць у адну з машын і паедуць разам з маладымі ў ЗАГС або храм, то тут жа сваімі рукамі «разбураць» той духоўна-энергетычны кокан (непранікальную сферу), які некалькі імгненняў таму спрабавалі абараніць сваіх дзяцей. Дзіўнае непаразуменне: самі ладзілі кола непарушнасці і тут жа самі яго разбурылі! А таму яшчэ раз робім выснову: **бацькам маладых не пажадана прысутнічаць на рэгістрацыі ў ЗАГСе, гэтаксама як бацькі ніколі не прысутнічалі падчас вянчання ў храме**. Нічога парадаксальнага ў гэтым няма. Яшчэ раз узгадайце: некалі вы нарадзілі сына або дачку, аднак правва пахрысціць іх вы перадаручылі зусім іншым людзям, якія з таго часу пачалі называцца хроснымі бацькамі. Менавіта яны — хросныя бацькі жаніха і нявесты — павінны прысутнічаць побач з маладымі і ў ЗАГСе, і ў храме.

**Па-трэцяе,** сёння можна сутыкнуцца яшчэ з адным непаразуменнем: нехта з гасцей прыязджае павіншаваць маладых непасрэдна ў ЗАГС. Дапускаць гэтага ні ў якім разе нельга, таму што яны парушаюць тое правіла, пра якое мы толькі што гаварылі: яны «разарвуць» кола, ўзведзенае бацькамі каля парога роднай хаты.

### І яшчэ адзін важны напамін

У абрадзе провадаў маладых маецца яшчэ некалькі падводных рыфаў, аб месцы размяшчэння якіх і характары іх уздзеяння на агульнае развіццё ўрачыстасці павінен ведаць кожны. І маладыя, і іх сваякі павінны памятаць: калі бацькі нявесты знаходзяцца ў разводзе, калі хтосьці з бацькоў памёр, то **няпоўная сям'я** (г.зн. калі ёсць толькі адзін з бацькоў) **не мае права адпраўляць маладых пад вянец**. Прынцып народнай культуры «падобнае выклікае падобнае» перасцерагае: як адправілі маладых у дарогу (не парай бацькоў), так неўзабаве і жыць яны будуць не ў пары. Якім жа чынам варта шукаць выйсце з такога становішча?

Тыя людзі, якія ад старэйшага пакалення чулі аб гэтым абрадавым прадпісанні і этыкетнай перасцярозе, просяць замест сябе выканаць адказны рытуал хросных бацькоў нявесты або жаніха. Гэта зноў-такі прынцыповая памылка. Яшчэ раз узгадайце: на саракавы дзень пасля нараджэння менавіта хросныя, а не фізічныя, бацькі прынясуць нованароджанага ў храм для хрышчэння. З гэтага моманту і да канца свайго жыцця яны будуць знаходзіцца побач з хрэснікам падчас усіх сямейна-родавых урачыстасцяў. Такім чынам, **менавіта яны павінны прысутнічаць побач з маладымі і ў храме** падчас шлюбу. І менавіта **таму яны не маюць права «замыкаць» вясельны поезд**, абносячы яго абразом і абсыпаючы збожжам. Гэты найадказнейшы рытуал павінны выканаць «пасажоныя» бацькі. Іх ролю можа выконваць шчаслівая сямейная пара, якая знаходзіцца ў блізкароднасных адносінах з жаніхом або нявестай (хоць дапускаецца ўдзел суседзяў, аднавяскоўцаў, г. зн. людзей чужых) і абавязкова мае сваіх дзяцей!

Не адзін раз даводзілася чуць ад людзей наступныя сентэнцыі: «Як гэта так, я нарадзіла, узгадавала дзіця, укладвала ў яго сэрца і душу, а адправіць да вяца не магу!» Матчына рытарычнае пытанне заканамернае і зразумелае: усё сваё жыццё прысвяціць дзецям, а ў самы адказны момант даручыць іх долю чужым людзям? Чыста пачалавечы ўсё зразумела, аднак існуюць сотні сведчанняў нашых сучаснікаў, якія пераканаўча даказваюць: лёс тых, хто праводзіць пару да вянца, самым непасрэдным чынам уплывае на долю маладых. Ці трэба ў такім разе набіваць лішнія «шышкі»? Можа, лепш даверыцца традыцыі і выкарыстаць вопыт сваіх папярэднікаў так, каб маладым пашчасціла на іх доўгім сумесным жыццёвым шляху.

**Аксана КАТОВІЧ,**
**Янка КРУК.**

Тэлесеткі

## Пераможцы «Танцаў з зоркамі» возьмуць удзел у «Еўрабачанні»

**Калі вам надакучылі песні «Еўрабачання», Еўрапейскі вяшчальны саюз прапануе абсалютна новы праект — танцавальны конкурс Eurovision Dance Contest. Як паведамілі ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, тэлегледачы Першага нацыянальнага не прапусцяць першае шоў і змогуць пабачыць танцавальнае «Еўрабачанне» 1 верасня а 22 гадзіне ў прамым эфіры.**

У конкурсе возьмуць удзел пары-пераможцы нацыянальных адбораў, якія праходзілі ў фармаце брытанскага шоў «Strictly Come Dancing» (беларусам больш вядомы яго расійскі аналаг «Танцы з зоркамі»). Наша краіна пакуль у новым праекце не прадстаўлена. За Расію ж на конкурсе выступяць тэлевядучая Марыя Сітэль і прафесійны танцор Уладзіслаў Барадзіноў. Наогул на званне самай лепшай пары прэтэндуюць танцоры з 16 краін: Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Грэцыі, Даніі, Ірландыі, Іспаніі, Літвы, Нідэрландаў, Польшчы, Партугаліі, Расіі, Украіны, Фінляндыі, Швейцарыі, Швецыі. Кожная пара прадставіць не адзін, а два танцы — першы з лацінаамерыканскай ці еўрапейскай праграмы, другі — у вольным стылі (перавагу лепш аддаць танцу з нацыянальным каларытам). Пару-пераможцу змогуць выбраць толькі гледачы краін-удзельніц пры дапамозе SMS-галасавання і прыёму званкоў (балы выстаўляюцца ад 1 да 12).

Весці танцавальнае «Еўрабачанне» будуць Грэм Нортан (эксвядучы шоў «Танцавальная ліхаманка») і Клаудзія Уінклман (эксвядучая брытанскага аналага «Фабрыкі зорак» і дзённіка «Танцаў з зоркамі»). Каментаваць прамую трансляцыю конкурса на Першым нацыянальным стане вядучы праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!» і ідэйны натхняльнік і эксвядучы праекта «Танцуюць усе» (ЛАД) Дзмітрый Карась. У якасці эксперта ў студыі яму будзе дапамагаць суддзя міжнароднай катэгорыі, суддзя чэмпіянатаў Еўропы і свету Уладзімір ПАРАХНЕВІЧ.

**Ірына ПРЫМАК.**

Факт

## У ВЕТЦЫ БУДУЦЬ САЖАЛКІ

Ажно васемнаццаць. І нават каналы працягласцю ў дзесяць кіламетраў. Прыгожа будзе? Напэўна, так. Але галоўная мэта іх будаўніцтва заключаецца ў паніжэнні ўзроўню грунтовых вод у гэтай мясцовасці, бо дажджы і вясновыя паводкі прыносяць жыхарам горада шмат нязручнасцяў. Каб ухіліць іх, дзяржаўнай праграмай ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы выдзяляецца каля двух мільярдаў рублёў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## УСМІХНЁМСЯ!

Навіны, коратка пра галоўнае: трохі пра надвор'е — спякотна; трохі пра палітыку — брудна; трохі пра культуру — сумна; трохі пра футбол — сарамліва.

☺

**Дзве сяброўкі:**

**— Ну і як першы абед тваіму мужу?**

**— Нармальна, заўтра выпішуць...**

☺

Вытрымка з меню. Безалкагольны кактэйль «Неўразуменне» (200 мл) — 4000 рублёў.

☺

**— Дзяўчына, дзяўчына! Які тэлефон, скажы мне — запомню!**

**— Ну запамінай, матэматык: восемдзесят дзевяць мільярдаў сто дваццаць сем мільёнаў семсот дзевяноста чатыры тысячы сто пяцьдзесят тры.**

☺

Рускія дзеці ў горадзе Сан-Хасэ вырашылі пажартаваць і запусцілі ў школу 3 свінні. Пры гэтым напісалі на іх фарбай нумары — 1, 2 і... 4. Тыдзень амерыканская паліцыя шукала свінню пад № 3.

☺

**— Тата, ты спіш?**
**— А што?**
**— Дай тысячу рублёў!**
**— Сплю, сынок, сплю...**




Рэабілітацыя

## ХТО ЛЕПШ ПІША І ЧЫТАЕ ... ПА СІСТЭМЕ БРАЙЛЯ?

**У сераду ў Брэсце пройдзе абласны конкурс «Я самы рэабілітаваны» сярод інвалідаў па зроку. У яго праграме — чытанне і пісьмо па сістэме Брайля, уменне працаваць на камп'ютары. Інваліды таксама будуць спаборнічаць на арыентацыі ў прасторы, пакажуць свае сацыяльна-бытавыя навыкі.**

Арганізатары галоўную задачу конкурсу бачаць у прыцягненні інвалідаў да актыўнай жыццядзейнасці, папулярызацыю ў іх асяродку актыўнага ладу жыцця. Заадно будуць падведзены некаторыя вынікі работы па праграме «Элементарная рэабілітацыя інвалідаў па зроку Брэсцкай вобласці», якую ажыццяўлялі цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў раёнах.

**Яна СВЕТАВА.**

Шайбу, шайбу!

# УПАРТЫЯ «РЫСІ»

### Хакеісты з горада над Сожам сталі першымі, каму ўдалося заваяваць Кубак Беларусі тройчы

Сталічны «Керамін» быццам праследуе злы рок: некалькі сезонаў запар мінчане не могуць задаволіць свае амбіцыі і выйграць у рашаючых фінальных сустрэчах, нягледзячы на лідарства ў рэгулярным чэмпіянаце ці аднакругавым турніры розыгрышу Кубка. З ярлыком «вечна другія» галоўны трэнер «драконаў» Андрэй Гусаў, зразумела, мірыцца не жадае: «Я ў шоку, ужо стаміўся ад такога завяршэння фінальных матчаў пры перавазе нашых кідкоў, — заявіў настаўнік 26 жніўня пасля пройгрышу гамяльчанам у Кубку Беларусі. — Мы ўжо і ў царкву хадзілі, і што толькі ні рабілі. Магчыма, арэну трэба змяніць?»

Сапраўды, прычыну пастаянных фіяска «Кераміна» ў фінале знайсці цяжка. Той жа «Гомель» ён перамог не так даўно ў аднакругавым турніры — 4:1, а ў нядзелю на сваёй жа пляцоўцы аддаў кубак гасцям — 2:4 (сярод керамінаўцаў вызначыліся Чупрыс і Жыдкіх, сярод «гамяльчан» — Брызгалаў, Ільін, Стэфановіч, Корабаў). Гэта пры тым, што гаспадары вялі на працягу двух перыядаў, і толькі ў трэцім «рысі» змаглі дагнаць каманду Андрэя Гусава і выйсці наперад (дзве гэтыя шайбы былі закінуты з розніцай у хвіліну!).

«Я схільны вініць у паражэнні не хакеістаў, а сябе, бо, значыць, не давёў да іх свае ўстаноўкі, — сказаў Андрэй Леанідавіч. — Канешне, яны памыляліся, але хто з нас не робіць памылак? Сапернік гэта выкарыстаў. Віншую «Гомель»! Нікому яшчэ мы не прайгравалі перыяд з лікам 0:3, як зараз». Цікава, што браты Касціцыны з «Манрэаля» гулялі за розныя каманды: старэйшы Андрэй за «Керамін», малодшы Сяргей за «Гомель».



Фота Вольгі ЛАСКА.

Такім чынам, пераможцай сёмага розыгрышу стаў «Гомель», які заваяваў кубак у трэці раз. «Рысі» ўступалі двойчы па ходу сустрэчы і здолелі праявіць спартыўны характар і псіхалагічную стойкасць на чужой арэне. Аднак нягледзячы на поспех, настаўнік гасцей Уладзімір Сініцын выказаў сумненне, ці варта праводзіць Кубак у жніўні:

— Толькі некалькі каманд ставяць перад сабой мэту выйграць, а для астатніх клубаў больш важна падрыхтавацца да чэмпіянату, але з-за правядзення розыгрышу яны не могуць выехаць на замежны збор. Акрамя таго, кубкавыя матчы і раз'езды стамляюць ігракоў, асабліва ветэранаў, якія выходзяць на пік формы пазней. З Гродна мы дабіраліся дамоў 9 гадзін. Каб арганізаваць паўнавартасны Кубак, трэба перагледзець фармат яго правядзення.

**Ірына ПРЫМАК.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (новая версія, якая тэсціруецца)
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.227 Індэкс 63850. Зак. № 4649. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12